## УВЕКАВЕЧВАННЕ ПАМЯЦІ АБ СЛАВУТЫМ ДЗЕЯЧЫ БЕЛАРУСІ Ф. СКАРЫНЕ

**Шумчык Марыя Мечыславаўна, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык Ратынская Н.В.*

Даклад прысвечаны памяці пра Скарыну, ўвекавечванню яе не толькі ў Беларусі, але і за межамі.З дакладу можна вынесці, што дзякуючы Скарыне беларускі народ і ўсе славяне пабагацелі адразу на тысячы новых кніг, кніг незвычайных, адрасаваных простаму чытачу.

*Ключавыя словы: ордэн і медаль Францыска Скарыны, назвы многіх вуліц беларускіх гарадоў, помнікі, бронзавая скульптура першадрукара каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, першая кніга, выдадзеная на тэрыторыі тагачаснай Беларусі ў Вільні, памяць за мяжой, мемарыяльныя дошкі ў гарадах Кракаве, Падуі, Дні Францыска Скарыны ў Празе, бібліятэка – музей імя Францыска Скарыны ў Лондане.*

## COMMEMORATION OF THE FAMOUS FIGURES OF BELARUS SKARYNA

**Shumchuk Maruya, Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor– senior lecturer Ratunskaya N. V.*

The report focuses on the memory of Skoriny perpetuate it not only in Belarus, but also for mezhami. Z report can be learned that, thanks to Skaryna Belarusian people and all Slavs become rich immediately to thousands of new books, books, unusual, addressed to the common reader.

*Keywords: order and medal of Francis Skaryna, the names of many streets of Belarusian cities, monuments, bronze sculpture pioneer in the National Library of Belarus, the first book published on the territory of the then Belarus in Vilnius, memory abroad plaques in the cities of Cracow, Padua, Days Francisco Skorina in Prague, library - named Francis Skaryna Museum in London.*

Францыск Скарына – ураджэнец старажытнага Полацка, выдатны філосаф, асветнік, гуманіст, пісьменнік, вучоны эпохі Адраджэння. Ён увайшоў у гісторыю як «бацька» ўсходнееўрапейскага кнігавыдання: менавіта Скарына ў 1517 годзе ўпершыню выдаў Біблію на старабеларускай мове для «людзей паспалітых да добрага навучання». Дзякуючы асветніку і першадрукару беларускае нацыянальнае кнігавыданне ўзбагаціла не толькі еўрапейскую, але і агульнасусветную культуру. Рэнесансныя выданні знакамітага палачаніна вызначалі высокуя якасць друку, характэрныя мастацкія, гравюрныя і арнаментныя ўпрыгожанні, шрыфты і іншыя кампаненты выдавецкай эстэтыкі і майстэрства. Адной з галоўных асаблівасцей усіх кніг Скарыны сталі аўтарскія каментарыі, якія дапамагалі «паспалітым» людзям лепш зразумець змест,



Рэпазіторый БГМУ

асэнсаваць значэнне падзей, адлюстраваных у кнігах Свяшчэннага Пісання. У красамоўных прадмовах, якія адлюстроўваюць гуманістычныя ідэалы і светапогляд Францыска Скарыны, прасочваюцца прыкметы іншых літаратурных жанраў, якія пазней атрымалі працяг у беларускай літаратуры і пісьменстве. Кнігі Францыска Скарыны распаўсюджваліся ў шматлікіх рукапісных копіях, і сапраўды не толькі паўплывалі на развіццё духоўнай культуры беларускіх зямель, але і ва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім, іншых усходнеславянскіх краінах, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Маскоўскай дзяржаве.

У Беларусі Францыск Скарына лічыцца адным з найвялікшых гістарычных дзеячаў. Памяць Францыска Скарыны, імя якога стаіць у адным радзе з такімі выдатнымі дзеячамі сусветнай культуры эпохі Адраджэння, як Леанарда да Вінчы, Рафаэль і Ян Амос Каменскі, увекавечана ў назвах вуліц многіх беларускіх гарадоў, універсітэта ў Гомелі, а таксама помніках, адным з якіх з'яўляецца бронзавая скульптура першадрукара каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У краіне заснаваны дзяржаўныя ўзнагароды – ордэн і медаль Францыска Скарыны, якія ўручаюцца за ўклад у развіццё і прымнажэнне духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны народа; асаблівыя заслугі ў гуманітарнай і дабрачыннай дзейнасці, поспехі на ніве нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння…

Сёння спадчына Францыска Скарыны налічвае 520 кніг, многія з якіх знаходзяцца ў Расіі, Польшчы, Чэхіі, Германіі. Усяго ж выданнямі беларускага першадрукара валодаюць каля 50 краін, у тым ліку і яго радзіма – Беларусь – 28 экзэмпляраў.

У 2017-м годзе, які прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, краіне ўдалося вярнуць унікальны помнік нацыянальнай культуры – «Малую падарожную кніжку», якая лічыцца першай кнігай, выдадзенай на тэрыторыі тагачаснай Беларусі ў Вільні.

Сярод галоўных падзей 2017-га года – прэзентацыя 20-томнага факсімільнага выдання «Кніжная спадчына Францыска Скарыны», прызёра Гран-пры конкурсу «Мастацтва кнігі», маштабная выстаўка «Францыск Скарына і яго эпоха», міжнародны тэлепраект «Францыск Скарына на мовах народаў свету» і дакументальны фільм «Першадрук», які пакажуць у рамках Дня беларускага пісьменства ў Полацку…

Акрамя таго, Лондан і Кракаў, Падуя і Познань, Вільня і Варшава, Кенігсберг – гарады, якія да сённяшняга дня памятаюць пра яго. У кожным з іх ёсць універсітэт або помнік, музей ці памятная дошка, на якіх напісана імя нашага вялікага земляка. Францыск Скарына – універсальна адукаваны чалавек, які валодаў многімі еўрапейскімі мовамі, але ставіў роднае слова вышэй за ўсё.

Нашы дзяржаўныя дзеячы імкнуцца, каб пра першадрукара памяталі ў краінах Еўропы. Савет Міністраў 4 верасня 1991 года падпісаў пастанову аб увекавечанні памяці Францыска Скарыны за мяжой.



Репозиторий БГМУ

У гонар святкавання 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны ўсталявалі помнік у горадзе Празе (тады ЧСФР), а таксама мемарыяльныя дошкі ў гарадах Кракаве (Польшча), Падуі (Італія).

У Падуанскім універсітэце ёсць выстава, дзе намаляваны фрэскавыя партрэты сарака найвялікшых выпускнікоў гэтай alma mater. Сярод іх, другі пасля Галілеа Галілея, – Францыск Скарына.

Праходзяць і мерапрыемствы ў гонар нашага вялікага земляка. У Празе (Чэхія), 30-31 кастрычніка 2012 года, па ініцыятыве Дзяржаўнага Камітэта РБ па друку і Пасольства Рэспублікі Беларусь у Чэхіі, адбыліся святы «Беларуская зорка», прысвечаныя 480-годдзю выдання «Псалтыра» Францыскам Скарынам.

10 – 12 снежня 2012 года ў сталіцы Чэхіі адбыліся Дні Францыска Скарыны ў Празе.

У Лондане ёсць бібліятэка – музей імя Францыска Скарыны, дзе сабраны выданні на беларускай мове.

У 1990 годзе адзначаўся 500-гадовы юбілей з дня нараджэння выдатнага сына беларускай зямлі. Гэтае свята адзначалася ў Беларусі і Літве, у Латвіі і ЗША, у Польшчы і Аўстраліі – паўсюль, дзе жывуць беларусы, дзе ведаюць пра подзвіг нашага земляка.

Памяць пра Скарыну не толькі ў помніках і ў кнігах, але і ў яго нашчадках, якія нясуць веды па ўсім свеце. Дзякуючы Скарыне беларускі народ і ўсе славяне пабагацелі адразу на тысячы новых кніг, кніг незвычайных, друкаваных, шырокадаступных, адрасаваных простаму чытачу. Дзякуючы нашаму першадрукару ўсходнеславянская кніга атрымала сучасны выгляд: з тытульным лістом, пранумераванымі старонкамі, са змястоўнай прадмовай і пасляслоўем, з ілюстрацыямі. У сваёй друкаванай “Бібліі” побач з біблейскімі героямі Скарына змясціў уласны партрэт. Гэты ўнікальны гравюрны партрэт захаваў нам праз стагоддзі сапраўдны воблік беларускага гуманіста.

Літаратура

1. Варонін, В.А. Беларускія землі у складзе Вялікага княства Літоускага / В.А Варонін. – Мінск : АСАР, 2010.– С.76-80.

2. Рагойша, В.П. Беларуская літаратура.Вучэбны дапаможнік для 9 класа устаноу агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Пад рэд. В.П. Рагойшы.–Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2011.– С. 51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ